# Прызнанне таленту

**Творчая сустрэча з Валянцінам Семянякам, дэпутатам, старшынёй Пастаяннай камісіі па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, па сваім характары магла б быць афіцыйнай з улікам яго статусу і ролі ў стваральнай працы на карысць беларускага грамадства. Аднак дзякуючы ўдзелу родных і блізкіх паэта імпрэза праходзіла ва ўтульнай атмасферы, быццам гэта не адно з мерапрыемстваў цыкла «Літаратурны Алімп Беларусі», а свята з нагоды нейкага юбілею.**




*Падчас сустрэчы.*

Жонка, дачка і ўнук Валянціна Міхайлавіча чыталі яго вершы, як, пэўна, не прачытаў бы больш ніхто — з вялікай пашанай і любоўю да аўтара. Менавіта ім паэт прысвяціў частку сваёй творчасці, а яшчэ — маці. Яна натхняла на радкі і калі была жывая, і калі пайшла ў іншы свет… Вершы пра маці гучалі вельмі кранальна, хоць апладысменты выклікалі і іншыя творы, у тым ліку той, на які натхніла творчасць Уладзіміра Высоцкага. Падчас імпрэзы выконваліся і песні на словы Валянціна Семянякі. На сустрэчу завітала шмат гасцей: землякі, калегі, сябры. Сярод іх — лаўрэат Нацыянальнай літаратурнай прэміі Уладзімір Мазго, які дапамог надрукаваць першыя вершы Валянціна Міхайлавіча і стаў рэдактарам яго кнігі.

Першы намеснік старшыні СПБ Алена Стэльмах падзякавала за магчымасць ажыццяўлення гэтага цудоўнага праекта, які знаёміць з паэтам, перакладчыкам, уладальнікам нагруднага знака «Выдатнік адукацыі Рэспублікі Беларусь», аўтарам кнігі паэзіі «Зорка залатая».

— Для кожнага пісьменніка ўзняцца на «Літаратурны Алімп Беларусі» ў Нацыянальнай бібліятэцы — вялікі гонар, прызнанне яго творчасці, таленту, — падкрэсліла Алена Анатольеўна. — Гэтая імпрэза асаблівая, бо калегі Валянціна Семянякі змогуць пабачыць яго ў іншай ролі. Тут сабралася многа людзей, якія рупяцца аб дабрабыце нашай краіны, аб тым, каб праблемы нашага грамадства былі вырашаны. У Валянціна Міхайлавіча шмат вершаў патрыятычнага, грамадзянскага характару, бо ён вельмі любіць сваю Радзіму. А яшчэ ён выдатна піша пра каханне, прыроду, ёсць у яго і сямейная лірыка.

Намеснік генеральнага дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Віктар Пшыбытка заўважыў, што Валянцін Семяняка піша пра вельмі важныя рэчы, пра якія варта памятаць усім, хто любіць сваю краіну.

**Ірына ПРЫМАК**

**Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА**